## ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА ПРАРЭКТАРА ЎНІВЕРСІТЭТА ПА НАВУКОВАЙ ПРАЦЫ ЛАРЫСЫ АЛЯКСАНДРАЎНЫ ТАРАСЕВІЧ

Шаноўныя ўдзельнікі і госці канферэнцыі! Паважаныя калегі!

Дазвольце ад імя аргкамітэта канферэнцыі сардэчна вітаць вас на юбілейнай XX Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць", прысвечанай 20-годдзю стварэння Цэнтра беларускай мовы і культуры ў МДЛУ.

Яна ладзіцца напярэдадні 80-й гадавіны з пачатку Вялікай Айчыннай вайны і праводзіцца ў камбінаваным фармаце (он- і офлайн). Аб сваім удзеле ў ёй заявілі амаль 50 даследчыкаў з Беларусі, Германіі, Польшчы і Расіі. Мы вельмі рады гасцям, асабліва замежным, сярод якіх добра нам вядомы гісторык з Расіі – прафесар Юлія Кантар, доктар гісторыі Дзмітрый Панцьё з Польшчы, дактары гісторыі Крысціян Ганцар і Крысціна Янеке, а таксама магістр гуманітарных навук Гундула Поль з Германіі.

Канферэнцыя арганізавана сумесна з Цэнтрам ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і адбываецца ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя) (падпраграма «Гісторыя»). Навукоўцы кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму разам са студэнтамі факультэта нямецкай мовы забяспечваюць выкананне тэмы НДР «Палітыка, практыка і наступствы нацысцкага эканамічнага генацыду на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. (на матэрыялах нямецкіх трафейных дакументаў НАРБ)». Мне прыемна адзначыць, што асновай другога пленарнага пасяджэння з'яўляюцца выступленні прадстаўнікоў гэтага архіва, у тым ліку яго былога дырэктара, які шмат год кіраваў гэтай установай, – кандыдата гістарычных навук Вячаслава Дзмітрыевіча Селяменева.

Знаёмства з праграмай канферэнцыі дае магчымасць адзначыць таксама той важны факт, што ў фокусе асабістых навуковых пошукаў і калектыўных даследчыцкіх праектаў знаходзіцца праблематыка, датычная гісторыі Беларусі перыяду Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Асабліва мне хочацца сказаць, што ваенныя падзеі вывучаюцца вамі на аснове не толькі дакументальных крыніц, але і вынікаў найноўшых навуковых распрацовак нямецкіх даследчыкаў. У гэтай сувязі хачу падкрэсліць яшчэ адзін важны момант, менавіта зварот да асабістых біяграфій людзей ваеннага часу: у вашым выпадку гэта ўспамін доктара гістарычных навук, прафесара, заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Канстанцінавіча Коршука, шматгадовага загадчыка кафедры гісторыі Мінскага іняза 1970-х – пачатку 1980-х гадоў.

Не менш цікавым мне бачыцца ўключэнне ў праграму прэзентацый дзвюх новых навуковых прац. Але асабліва кранальнай у праграме з'яўляецца заключная частка, прысвечаная памяці аднаго з заснавальнікаў традыцыі

правядзення канферэнцыі ў МДЛУ, старшага выкладчыка кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Сяргея Паўлавіча Кубекі, які на 81-м семестры працы ў нашым універсітэце пайшоў з жыцця.

Упэўнена, што новыя ідэі і высновы, да якіх вы прыйдзеце ў выніку абмеркавання пастаўленых праблемных і дыскусійных пытанняў, не застануцца толькі ў сферы акадэмічнай навукі, але паўплываюць на вырашэнне надзённых выхаваўчых задач у нашым грамадстве, асабліва ў справе патрыятычнага выхавання і прафесійнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі.

Шаноўныя калегі, госці і сябры МДЛУ! Дазвольце аб’явіць адкрытай юбілейную XX Міжнародную навуковую канферэнцыю “Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць” і пажадаць вам поспехаў.